Таким образом, применение рейтинговой системы контроля знаний студентов по дисциплине «Технологии социально-культурной деятельности» позволяет более объективно оценивать знания студентов, стимулирует их к самостоятельной творческой и научно-исследовательской работе, что позволяет развивать интерес к изучаемой дисциплине и психологически перевести студентов из разряда пассивных зрителей и слушателей в разряд активных участников педагогического процесса.

**В. І. Саітава,**
*дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі*
*інфармацыйна-дакументных камунікацый,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# ПАГЛЫБЛЕННЕ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ДА ДЗЕЙНАСЦІ З ФАКТАГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫЯЙ (на прыкладзе дысцыплін па выбары «Краязнаўчае крыніцазнаўства» і «Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэцы»)

Інфармацыйнае забеспячэнне грамадства з часу ўзнікнення самой з'явы інфармавання патрабавала выпрацоўкі метадаў згортвання фіксаваных тэкстаў (дакументаў) і прадстаўлення новых створаных кагнітыўных вобразаў у эканомнай знакавай сістэме, што на ўсіх гістарычных этапах спрыяла аптымізацыі інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў. Атрыманне спецыяльнасці бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі прадугледжвае грунтоўнае вывучэнне дысцыплін бібліяграфазнаўчага цыкла, што цалкам адпавядае ролі бібліяграфічнай інфармацыі ў сучасным грамадстве. Таксама ў наш час адзначаецца павышэнне грамадскай запатрабаванасці ў фактаграфічнай інфармацыі, якая, як і бібліяграфічная інфармацыя, з'яўляецца відам сацыяльнай другаснай інфармацыі.

Роля фактаграфічнай інфармацыі ў сучасных умовах узрастае. У наш час пастаўшчыкамі рэсурсаў фактаграфічнай інфармацыі з'яўляюцца камерцыйныя структуры: інфармацыйныя карпарацыі, агенцтвы, службы і цэнтры, якія генерыруюць велізарныя патокі інфармацыі ў разнастайных формах і рэжымах.

З фактаграфічнай інфармацыяй традыцыйна працуюць бібліятэкі, выкарыстоўваючы пераважна тую яе частку, што ства-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раецца на падставе перапрацоўкі першасных дакументаў (тэкстаў). У даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі адбіраюцца даведачныя выданні: найбуйнейшыя і профільныя для канкрэтнай бібліятэкі фактаграфічныя рэсурсы; самастойна бібліятэкамі ствараюцца фактаграфічныя картатэкі і базы даных. У даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні выкарыстоўваецца фактаграфічны пошук і выконваюцца фактаграфічныя даведкі. З'явай апошніх дзесяцігоддзяў стала стварэнне аддзеламі маркетынгу ЦБС фактаграфічных выданняў, як правіла, невялікага аб'ёму, але разнастайных па змесце і жанрах. Абласныя і спецыяльныя бібліятэкі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі на сучасным этапе мэтанакіравана пашыраюць стварэнне нацыянальных фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў, аддаючы прыярытэт базам даных [*Кузьмініч, Т. В*. Бібліятэчны сегмент нацыянальных фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў : тэарэтыка-метадычны аналіз // Бібліятэчны веснік : зб. арт. Вып 1. Мінск, 2010. С. 45–59.].

Варта адзначыць, што ўжо працяглы час у прафесійным друку адзначаецца тэндэнцыя павышэння колькасці фактаграфічных запытаў і іх ускладненне. Сцвярджаецца, што спажыўцам інфармацыі ўсё больш патрэбны фактычныя звесткі. Выпускнікі факультэта распачынаюць краязнаўчую дзейнасць, якая вядзецца ў бібліятэках краіны, абапіраючыся на веды і ўменні, набытыя пры вывучэнні дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства». Але пытанні работы з фактаграфічнай інфармацыяй не атрымалі ў гэтай дысцыпліне дастатковага адлюстравання. Таму пытанне работы з фактаграфічнай інфармацыяй патрабуе ўвагі ў працэсе навучання студэнтаў. Пакуль што гэты напрамак слаба адлюстраваны ў тэарэтычных і прыкладных аспектах. Гэтым абумоўлена распрацоўка двух аўтарскіх дысцыплін па выбары «Краязнаўчае крыніцазнаўства» і «Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэцы».

Названыя дысцыпліны звязаны тым, што выкананне фактаграфічных запытаў, фактаграфічны пошук часта патрабуюць спецыяльных ведаў. Першая з дысцыплін мае крыніцазнаўчы характар і прызначана даць студэнтам веды, якія дапамагаюць правільна выконваць краязнаўчыя запыты спажыўцоў інфармацыі, выяўляць крыніцы, якія змяшчаюць невядомыя факты, правільна іх разумець і выкарыстоўваць. Дысцыпліна «Краязнаўчае крыніцазнаўства» дапамагае авалодаць асноўным па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няційным складам актуальнай і ў сваім родзе класічнай часткі краязнаўства, без якой дзейнасць з аб’ектамі краязнаўчай інфармацыі, зносіны з прадстаўнікамі краязнаўства (навукоўцамі, спецыялістамі і аматарамі) ускладняюцца; класіфікацыяй крыніц, уменнямі выяўляць кола значных і даставерных крыніц, методыкай сінтэзу новых краязнаўчых ведаў пры ўдзеле бібліятэкара-бібліёграфа ў даследчай дзейнасці па краязнаўстве.

Таму пры распрацоўцы «Краязнаўчага крыніцазнаўства» адной з задач было засваенне студэнтамі фактаў (паняццяў, падзей, з’яў і інш.) з розных галін краязнаўства, якія сёння з’яўляюцца вынікам вывучэння рэгіёнаў Беларусі. Зразумела, што інтэграцыйнасць краязнаўства патрабавала дакладна вызначыць кола такіх ведаў. Тэматыка, якая вызначылася, суадносілася са структурай крыніцазнаўства, перш за ўсё гістарычнага, і дакументалогіі для вызначэння складу крыніц, з дапамогай якіх магчыма выяўляць, вывучаць і апісваць рэгіянальныя падзеі і з’явы. У структуру дысцыпліны ўключаны тэмы, прысвечаныя афіцыйным дакументам па гістарычных перыядах ВКЛ, Расійскай імперыі, міжваеннага перыяду адносна тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. (перыяды БССР і Рэспублікі Беларусь не закранаюцца, паколькі адлюстраваны ў іншай вучэбнай дысцыпліне); матэрыялам справаводства і статыстыкі, мемуарнай літаратуры; крыніцам па геральдыцы і генеалогіі беларускіх рэгіёнаў і населеных пунктаў, па рэгіянальнай анамастыцы і тапаніміцы Беларусі; рэгіянальным асаблівасцям беларускай мовы, а таксама краязнаўчым фотадакументам. Крыніцы, якія вывучаюцца, ахопліваюць як выданні, так і рэсурсы Інтэрнету.

Кантроль ведаў паказвае, што студэнты ў цэлым паспяхова авалодваюць паняційным апаратам, методыкай фактаграфічнага і непарыўна звязанага з ім бібліяграфічнага пошуку па крыніцах розных форм і структуры. Напрыклад, ажыццяўляючы пошук звестак аб пэўных асобах, студэнты выкарыстоўвалі дарэвалюцыйныя і сучасныя гербоўнікі і іншыя выданні, DVD-ROM Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Памятныя кніжкі …губерні», шэраг генеалагічных электронных рэсурсаў («Всероссийское генеалогическое древо» і інш.), сямейныя дакументы. Варта адзначыць і цікавасць студэнтаў да гэтай дзейнасці.

Такім чынам, у выніку вывучэння дысцыпліны «Краязнаўчае крыніцазнаўства» ў студэнтаў пачынае фарміравацца той база-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вы ўзровень краязнаўчых ведаў, якія дазваляюць паспяхова засвойваць прадметную вобласць краязнаўства, бачыць перспектыўную праблематыку, дакладней разумець сэнс запытаў карыстальнікаў, ацэньваць узровень фактаграфічнай асновы крыніц, праводзіць фактаграфічны пошук і т. п.

Мэта дысцыпліны «Стварэнне фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі ў бібліятэцы» – даць пачатковыя веды па працэсах падрыхтоўкі гэтай прадукцыі. На лекцыях асвятляюцца тэарэтыка-метадычныя пытанні фактаграфічнай інфармацыі, яе жанрава-тыпалагічная разнастайнасць, метады стварэння фактаграфічных запісаў розных узроўняў.

Практычныя работы і часткова СРС арыентаваны на азнаямленне з друкаванымі і электроннымі формамі фактаграфічных рэсурсаў і стварэнне фактаграфічнай прадукцыі. Студэнтам прапануецца стварыць слабаструктураваныя фактаграфічныя матэрыялы, паколькі менавіта такія матэрыялы выдаюць ЦБС. Тлумачыцца гэта з'ява, на нашу думку, тым, што пераўтварэнне структур інфармацыйных аб'ектаў фактаграфічнага характару вядзецца з разлікам на шырокія колы карыстальнікаў ці іх асобныя групы на падставе сацыяльна-дэмаграфічных характарыстык ці аматарства. Адпаведна сваёй грамадскай ролі, публічныя бібліятэкі сістэматычна вядуць адбор каштоўнасцей, таго, што сацыяльна прызнана, з'яўляецца бясспрэчна каштоўным у бягучы час. Таму ў ствараемых фактаграфічных рэсурсах (хроніках краю, календарах памятных дат, даведніках, біяграфічных матэрыялах, і інш.) заўсёды дамінуе мэта фарміравання ў карыстальнікаў цэнасных уяўленняў. Краязнаўчыя і беларусазнаўчыя факты належаць да ліку надзвычай каштоўных і ўнікальных. Таму пры вывучэнні дысцыпліны звярталася ўвага на фарміраванне ўменняў выяўляць факты, ацэнку іх дакладнасці і структуравання, паслядоўнага адлюстравання прынятай структуры, мэтанакіраванага выкарыстання папулярнага ці інфармацыйнага стылю. Студэнты самастойна стваралі ўзоры хранікальных, персанальных, даведачных Жанраў фактаграфічных рэсурсаў: выяўлялі інфармацыйныя аб'екты, абмяркоўвалі структуру фактаграфічных запісаў з улікам мэты і карыстальніцкай арыентацыі жанра, які мадэляваўся, іх моўны стыль, стратэгію фактаграфічнага і бібліяграфічнага пошуку, ілюстрацыйнае афармленне.

У азнаямленчым аспекце студэнты даведаліся пра фактаграфічныя БД беларускіх і расійскіх бібліятэк, фактаграфічныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыялы, прадстаўленыя на сайтах расійскіх абласных бібліятэк, і зрабілі параўнальную характарыстыку гэтых рэсурсаў. Студэнтам прапанавалі звярнуць увагу на выпрацаваныя алгарытмы паказу інфармацыі, аб'екты адлюстравання, пошукавыя магчымасці, аператыўнасць абнаўлення, арыгінальнасць інтэрфейсу. У фактаграфічных рэсурсах расійскіх абласных бібліятэк на больш высокім узроўні паказана структура фактаграфічных запісаў, рэалізаваны развітыя гіпертэкставыя сувязі.

Студэнты прыходзяць да высновы аб перспектыўнасці далучэння да фактаграфічных звестак не толькі бібліяграфічных запісаў, што арганічна для фактаграфічных паведамленняў, але графічных, паўнатэкставых, відэа і іншых матэрыялаў. Гэта значна пашырае ўяўленні аб патэнцыяле фактаграфічных рэсурсаў і стымулюе да аснашчэння такімі матэрыяламі самастойна ствараемых прадуктаў.

Такім чынам, прапанаваныя дысцыпліны па выбары садзейнічаюць прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў да дзейнасці з фактаграфічнай інфармацыяй краязнаўчага і беларусазнаўчага характару ў шырокім спектры – ад выданняў розных жанраў да шматузроўневых электронных інфармацыйных рэсурсаў энцыклапедычнага характару. Невыпадкова частка заняткаў праводзіцца на базе ВНВК з Мінскай абласной бібліятэкай імя А. С. Пушкіна, у НББ і іншых бібліятэках.

**Н. В. Самерсова,**
*доцент кафедры менеджмента социокультурной деятельности, кандидат педагогических наук, доцент*

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ИНТЕРАКТИВНЫХ МЕТОДОВ ОБРАЗОВАНИЯ В ПРЕПОДАВАНИИ ДИСЦИПЛИНЫ «ИМИДЖЕЛОГИЯ»

Растущий интерес к проблеме формирования имиджа личности не случаен. Особенно это касается ситуаций, где имидж является частью профессионального успеха. Трудно переоценить важность и значимость курса «Имиджелогия» в становлении специалиста социокультурной сферы. В наши дни только профессиональные умения и навыки не обеспечивают работнику культуры достижения вершин мастерства в избранной

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ